# *Урок беларускай мовы ў 2 класе па тэме: “Зычныя гукі і літары. Замацаванне вывучанага”*

## ХОД УРОКА

### *1. Пачатак урока*

- Дзеці, выйдзеце, калі ласка, да дошкі. Возьмемся за рукі, сажміце далоні, усміхніцеся і перадайце добры настрой суседу.

- Я хачу, каб вы заўсёды былі такія вясёлыя, бадзёрыя і , галоўнае, - здаровыя.

Каб наш сенняшні ўрок назаўсёды застаўся ў вашай памяці.

- (Чытаем з дошкі хорам.) Як хораша, што мы на ўроку,

У нас усё атрымаецца!

### *2. Работа па тэме*

- Паглядзіце на запіс і здагадайцеся, чым мы будзем займацца на ўроку:

руча**й** – руча**і**,
н**о**с – н**ё**с,
сн**е**г – сн**я**гі,
сям**’**я, міл**ь**ён,
кало**сс**е

- На гэтым уроку мы замацуем нашы веды пра зычныя гукі і літары, пра знакі і адправімся ў падарожжа ў горад **ГУКАЎ**.

- У гэтым горадзе вельмі шмат вуліц, завулкаў, ёсць нават плошча, на якіх мы зараз пабываем.

- Але, каб апынуцца ў гэтым горадзе, трэба ўспомніць, на якія дзве групы дзеляцца ўсе гукі беларускай мовы? (Галосныя і зычныя.)

- І вось ідзём мы па дарозе, якая з двух бакоў абсаджана дубамі:

Дарога абсаджана дубамі,
Адзін жолуд – гэта дуб,
Ён і зямлі, і птушкам люб.
Поўны кошык жалудоў –
Гэта ж тысяча дубоў.

- Глядзіце, літары ў запісаных радках стаяць, як магутныя дубы.

**<u>ЧЫСТАПІСАННЕ</u>**

бб дбд двб
дуб дубовы дуброва

- Прачытайце словы. Як вы разумееце слова <u>дуброва</u>? Давайце складзем сказ з гэтым словам. (Вусна.) Запомніце, як пішыцца і, што абазначае слова дуброва.
- І вось мы прыйшлі на вуліцу **ГАЛОСНЫХ**. Давайце ўспомнім, колькі галосных літар у беларускай мове? А колькі гукаў? Назавіце іх. Жыхары гэтай вуліцы прапануюць выканаць наступнае заданне. Трэба змяніць словы з літарай й, каб на канцы слова стала літара і:

**герой – героі,**
**ручай - ...,**
**гай – у ...,**
**вырай – у ...,**
**трамвай - ...,**
**вулей - ... .**

- Пойдзем далей падарожнічаць па нашаму гораду. Наступная вуліца **ЗЫЧНЫХ.** Якімі бываюць зычныя гукі? (Цвердыя і мяккія, звонкія і глухія.)
- Заданне жыхароў вуліцы:
  1 вучань - выпісаць словы, у якіх усе зычныя гукі цвердыя;
  2 вучань – выпісаць словы, у якіх усе зычныя гукі мяккія.

**<u>- Сіні, лапа, стол, вялікі, ляціць, ліпень, кот, атрад, дзеці, дзень, барсук, капуста.</u>**

ФІЗКУЛЬТХВІЛІНКА

Б'юць яго рукамі,
Б'юць яго нагамі,
Ён не скардзіцца, не плача,
Моўчкі лётае і скача.

- Як хутка ляціць час! Пакуль вы пісалі заданне, мы апынуліся на школьным стадыене. Гульня "**ВАЛЕЙБОЛ**"
  Наш мяч прапануе праверыць парны зычны гук на канцы або ў сярэдзіне слова. Давайце ўспомнім, што трэба зрабіць, каб праверыць парныя звонкія і глухія зычныя на канцы і ў сярэдзіне слова?
- **<u>Зуб, дуб, завод, горад, снег, мароз, дождж, лодка, сцежка, трубка, казка.</u>**
- Мы так далека кідалі мяч, што ён трапіў на плошчу **ЗНАКАЎ**.

На вуліцы зараз зіма. Амаль кожны дзень падаюць сняжынкі на зямлю. Вось і да нас яны завіталі і пачалася завіруха на плошчы:

Пад нагамі снегапад,
Сняжынкі прыгожыя ляцяць,
Сняжынкі белыя ляжаць.
А пад сняжынкамі шуршаць
Шурх, Шуршыха і Шуршонак –
Тата, мама і лісценак.

- Вучні падымаюць сняжынку і выконваюць заданне ў сшытку. (Уставіць прапушчаны знак: апостраф або раздзяляльны мяккі знак.)
- **Паштал..ён, звяр..ё, надвор..е, Іл..я, ве раб..і.**

- **Пал..е, пер..е, сям..я, Ул..яна, л..е.**
  (Памяняцца заданнямі. Узаемаправерка.)
- Дуброва, пра якую мы гаварылі ў пачатку ўрока, прыслала да нас дуб з чароўнымі жалудамі. І кожны жолуд з заданнем. Дуб мне прашаптаў, што трэба словы з падоўжанымі зычнымі падзяліць для пераносу. Успомнім правіла пераносу такіх слоў.
- Голле, зацішша, ранне, разводдзе, вуголле, калоссе, каменне, узлессе.
- (Праверка.)

### *3. Замацаванне*

- Гульня “**ЧАТЫРЫ ВУГЛЫ**”
- Чорны круг – напісанне літар і-й;
  Зялены круг – правапіс парных звонкіх і глухіх зычных;
  Чырвоны - падоўжаныя зычныя;
  Жоўты – апостраф і раздзяляльны мяккі знак.
  Словы: **ручай – ручаі,**
  **п’е,**
  **каменне,**
  **казка – казачка,**
  **льюць,**
  **стагоддзе,**
  **мядзведзь – мядзведзі,**
  **музей – музеі,**
  **надвор’е,**
  **зацішша,**
  **суп – супы.**

### *4. Вынік урока. Рэфлексія.*

- Што спадабалася на ўроку?
- Што хацелі б выканаць яшчэ раз?
- З якім настроем пакідаеце ўрок? Падыйдзіце да адпаведнага кружка (чырвоны – радасны, сіні – сумны).

У ахвоту работу зрабіўшы,
Палюбуйся, як добра ўсё выйшла.
Лепшай радасці ў свеце няма:
- Я зрабіў гэта сам!
- Я зрабіла сама!

- А зараз ацаніце сваю працу на працягу ўсяго урока, дамалюйце сонейку роцік ( уверх – выдатна, прамы – добра, уніз – дрэнна).
- Я думаю, наш сённяшні ўрок пакінуў у вашых сэрцах радасць і захапленне. Вы вельмі добра працавалі. Малайцы! Вялікі дзякуй за добрасумленную працу на ўроку.